View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE

УДК 94(476):323.285

АЗЕФ ЕЎНА ФІШАЛЕВІЧ (З ГІСТОРЫІ БАРАЦЬБЫ З ТЭРАРЫЗМАМ)

д-р гіст. навук, праф. І.А. БАСЮК
(Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы)

Даследаванне прысвечана рэвалюцыйнай дзейнасці ўраджэнца Беларусі, Азэфу Еўна Фішалевічу, кіраўніку Баявой арганізацыі партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Аналізуецца тактыка тэрору, якая праводзілася сацыялістамі-рэвалюцыянерамі, палітычныя наступствы гэтай тактыкі, прычыны яе крызісу. Метадам тэрору сацыялісты-рэвалюцыянеры спрабавалі выклікаць адказныя рэпрэсіўныя меры царскага ўрада, магчыма і паўстанне. Частка сацыялістаў-рэвалюцыянераў лічылі, што метадам тэрору магчыма запалохаць цара і прымусіць яго пайсці на палітычныя рэформы. Асноўная ўвага нададзена асобе Азефа, кіраўніку тэрарыстаў, які адначасова быў сакрэтным агентам царскай паліцыі, яго жыццю і палітычнай кар'еры. Адлюстраваны некаторыя дадзеныя аб складзе Баявой арганізацыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, аб колькасці ахвяр яе тэрору.

Сёння няма неабходнасці падкрэсліваць актуальнасць барацьбы з тэрарызмам, бо зараз тэрарызм увасобіўся ў такую грамадскую язву, ад якой пакутуюць амаль усе дзяржавы свету, і пакуль няма рэцэпта такога лякарства, якое пазбавіла б чалавецтва ад гэтай навалы. Тэрарызм не толькі не ўтаймоваецца, але, як ракавая пухліна, распаўсюджваецца па Планеце, набывая ўсё больш бесчалавечныя формы: з барацьбы супраць палітычных ворагаў тэрарызм вар'яцкі перакінуўся на сваіх суграмадзян. 11 верасня 2001 года самалёты, захопленныя тэрарыстамі, атакавалі вежы Сусветнага гандлёвага цэнтра ў Нью-Йорку і будынак Пентагона ў Вашынгтоне – загінулі больш 3 тысяч чалавек. У верасні 2004 года адбыўся жудасны Бесланскі тэракт, калі група тэрарыстаў захапіла заложнікаў – вучняў і іх бацькоў сярэдняй школы № 1 Беслана (Паўночная Асеція). У выніку тэракта загінулі больш 300 чалавек, сотні вучняў і іх бацькоў былі паранены [1]. Не абыйшла навала тэрарызму і нашу радзіму – Беларусь. У 2011 годзе адбыўся выбух у мінскім метро, ад якога пацярпелі ні ў чым не вінаватыя людзі.

Тэрарызм узнік не сёння і не ўчора, тэрмін тэрор (лац. terror – страх, жах) увайшоў ва ўжыванне ў канцы XVIII стагоддзя для абазначэння рэпрэсійнай палітыкі, якая праводзілася якабінцамі ў часы Вялікай Французскай рэвалюцыі. Затым тэрмін "тэрарызм" набыў універсальнае значэнне для абазначэння прымусу з палітычнымі ці іншымі мэтамі.

У Расійскай імперыі тэрарызм як метад палітычнай барацьбы супраць самадзяржаў'я пачаў выкарыстоўвацца рэвалюцыйным рухам з 1860-х гадоў і прайшоў у сваім развіцці два "пікі" (пад'ёмы): першы "пік" прыйшоўся на 1878–1882 гады і быў звязаны з нарадавольцамі; другі – на 1901–1911 гады, ён быў звязаны з рэвалюцыйнай барацьбой партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэраў).

Азеф Еўна Фішалевіч

У нашым даследаванні мы разгледзім тэрарызм 1901–1911 гадоў, бо менавіта гэты перыяд звязаны з кіраўніком эсэраўскіх тэрарыстаў-баявікоў, ураджэнцам Беларусі Азефам Еўна Фішалевічам.

У расійскай гістарыяграфіі маецца значная колькасць літаратуры і крыніц аб жыцці і дзейнасці Еўна Фішалевіча. Адзначым працы Л.Г. Прайсмана, М.А. Алданава, Л.В. Бурцава, Б. Нікалаеўскага, успаміны жандарскіх генералаў А.В. Герасімава, А.І. Спірыдовіча. Асабліва каштоўнымі для нашага даследавання ўяўляюцца ўспаміны жандарскага генерала А.І. Спірыдовіча [2], які добра ведаў Азефа. Спірыдовіч у сваіх мемуарах дзеліцца з чытачамі сваімі назіраннямі, трапнымі характарыстыкамі паводзін Азефа, аналізуе яго светапогляд, адносіны да рэвалюцыі, тэрору, да супрацоўніцтва з паліцыяй, разважае аб прычынах узлётаў і правалаў яго рэвалюцыйнай і паліцэйскай кар'еры.

Мы неаднаразова будзем спасылацца на яго ўспаміны, хаця і з долей крытыкі, бо з'явы і падзеі тагачаснай Расіі Спірыдовіч ацэньваў праз прызму светаўспрымання жандарскага афіцэра, які сумленна і аддана служыў расійскаму імператару.

Значная частка матэрыялаў аб Азефе змешчана ў сецівах інтэрнэта, некаторыя з іх таксама выкарыстаны пры падрыхтоўцы дадзенай працы.

На Беларусі жыццё і дзейнасць Еўна Азефа па шэрагу прычын выпалі з поля зроку айчынных гісторыкаў, ён нават не ўпамінаецца ў фундаментальнай працы – 6-томнай Энцыклапедыі гісторыі Бела-

русі. У 18-томнай Беларускай Энцыклапедыі змешчаны невялічкі артыкул аб Азефе, у якім прыведзены толькі некаторыя агульныя аб ім звесткі. У артыкуле дапушчана недакладнасць: адзначана, быццам Азеф нарадзіўся ў горадзе Гродна, што не адпавядае сапраўднасці (т. 1, с. 162).

Такім чынам, прыведзены кароткі агляд літаратуры і крыніц сведчыць, што гістарычная постаць Азефа слаба даследавана ў айчыннай літаратуры.

Мэта нашага даследавання – у нейкай меры запоўніць узнікшы прабел айчыннай гістарыяграфіі аб Баявой арганізацыі партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў і яе лідэра Еўна Азефа, паказаць яго беларускія старонкі жыцця. Навізна працы, на наш погляд, – зрабіць спробу адлюстраваць дваістасць натуры Азефа як рэвалюцыянера, кіраўніка Баявой арганізацыі партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, так і яго супрацоўніцтва з царскай паліцыяй у якасці сакрэтнага агента.

Прааналізуем светапогляд Азефа, вытокі яго дваістай натуры, уплыў на фарміраванне яго духоўнасці цяжкіх жыццёвых абставін дзяцінства і юнацтва, блізкіх яму людзей, непамернай скрытнасці і прагнасці да грошай і раскошы.

На наш погляд, каб зразумець супярэчлівую постаць Азефа, патрэбна звярнуца да яго дзіцячых і юнацкіх гадоў, бо менавіта ў гэты перыяд сфарміраваліся асновы яго поглядаў і прынцыпы жыццёвай логікі, якія ў больш сталым узросце і сталі вызначальнымі крытэрыямі яго духоўных і матэрыяльных арыенціраў, рухавіком яго жыццёвых імкненняў. Калі акінуць поглядам дзяцінства і юнацтва Азефа, то найбольш уразлівай адметнасцю гэтага перыяду была зняважлівая яго асобу беднасць, недахоп самага неабходнага, ён жыў, па выразу тых часоў, на “медныя грошы”.

Еўна Фішалевіч Азеф нарадзіўся 11 ліпеня 1869 года на Беларусі, у мястэчку Лыскава Гродзенскай губерні ў сям’і беднага яўрэя-краўца. Сям’я была вялікай – сямёра дзяцей (тры сыны і чатыры дачкі), Еўна быў другім дзіцём. Сямярых дзяцей на сціплы заробак краўца ў невялічкім беларускім мястэчку пракарміць, адзець, абуць, вывучыць, ці як у тыя часы казалі “вывесці ў людзі”, было вельмі складана. У Азефаў узнікла ідэя пераехаць з мястэчка ў горад, заняцца камерцыяй, гэтым паправіць матэрыяльнае становішча сям’і і даць дзецям хаць б сярэднюю адукацыю. Выбар выпаў на горад Растоў, які знаходзіўся на тэрыторыі яўрэйскай аселасці.

У Растове бацька Еўна, Фішаль Азеф, вырашыў заняцца гандлем, які, на яго погляд, мог хутка паправіць матэрыяльнае становішча сям’і. Але надзеі Фішаля не спраўдзіліся, гандаль не прынёс матэрыяльнага дастатку, сям’я цярпела крайнія нястачы, гэта выклікала раздражальнасць і бясконцыя сваркі бацькоў. Па сведчанні малодшага брата Еўна, Уладзіміра, у сям’і сваркі нават перарасталі ў бойкі, ад якіх “мама збегла з дому” [3, с. 1]. З-за цяжкіх адносін у сям’і Еўна прымушаны быў таксама сыйсці з бацькоўскай хаты і некаторы час туліцца на прыватнай кватэры [3, с. 1].

Але нягледзячы на матэрыяльныя цяжкасці, Еўна ўсё ж змог, па адных звестках, навучацца ў гімназіі, па другіх – у рэальным вучылішчы. З навучаннем ў Еўна спярша не заладзілася: з вучылішча ён быў выключаны за нейкі праступак, але не разгубіўся, праз тры гады здаў экстэрнам экзамены за курс рэальнага вучылішча і, такім чынам, атрымаў сярэднюю адукацыю [3, с. 1].

У вучылішчы Еўна не карыстаўся павагай, яго лічылі “скрытаю душою” і “фіскалам”, адзначалі яго грубасць [3, с. 2]. Пасля выключэння з вучылішча Еўна перабіваўся выпадковымі заробкамі: быў рэпарцёрам мясцовай газеты “Данская пчала”, служыў пісарам у канторах, даваў прыватныя ўрокі. Перспектыў на лепшае жыццё не прадбачвалася і гэта прыгнятала маладога Еўна.

Яшчэ ў вучылішчы Еўна звязаўся з гуртком нарадавольцаў, займаўся распаўсюджваннем лістовак. Паліцыя напала на след гуртка, пачаліся арышты. Еўна выявіў за сабою слежку і зразумеў, што ў Расіі, акрамя турмы, яму чакаць няма чаго. Месцам прытулку Азеф выбраў Германію; але для эмігрыцыі патрэбны былі сродкі. Прадпрымальны Азеф па даручэнні нейкага купца прадаў яго тавар – масла на 800 рублёў, выручаныя грошы прысвоіў, фактычна – украў [3, с. 3]. На скрадзеныя грошы эмігрыраваў; вясной 1892 года аказаўся ў Карлсруэ (Германія), дзе паступіў вучыцца ў мясцовы палітэхнічны інстытут. У Германіі ён зблізіўся з рэвалюцыйна настроенай моладдзю, неўзабаве стаў членам мясцовага сацыял-дэмакратычнага гуртка.

Сродкаў у маладога Азефа катастрафічна не хапала, ён быў прымушаны шукаць новыя крыніцы для папаўнення ўласнага бюджэту. Найбольш прывабнай крыніцай Еўна палічыў патаемнае супрацоўніцтва з паліцыяй па формуле: ён паліцыі – звесткі аб рэвалюцыйных гуртках расійскіх паданых за граніцай, паліцыя – дастойнае жалаванне за інфармацыю. З гэтай мэтай 4 красавіка 1893 года, праз год пасля прыбыцця ў Германію, Еўна даслаў у Дэпартамент паліцыі пісьмо аб рэвалюцыйна настроеных расійскіх студэнтах за граніцай, аб іх спробах стварыць рэвалюцыйную арганізацыю. Пісьмо заканчвалася прапановай сакрэтнага супрацоўніцтва з паліцыяй. “Калі звесткі, якія я магу вам даць, – пісаў Азеф, – знойдзеце карыснымі, тады прашу мяне аб гэтым уведаміць заказным пісьмом” [3, с. 3].

Звернем увагу на важную акалічнасць: звычайна агентамі паліцыі станавіліся тыя асобы, перад якімі паліцыя ставіла выбар – або за рэвалюцыйную дзейнасць турма, або патаемнае супрацоўніцтва. Еўна Фішалевіч па ўласнай ініцыятыве прапанаваў супрацоўніцтва з паліцыяй, галоўны матыў такога паступка – не барацьба з рэвалюцыяй, а ўласная нажыва.

Паліцыя адгукнулася на прапанову Азефа, пачалася перапіска аб характары інфармацыі, аб умовах і памерах аплаты. Пры гэтым ён паставіў умову – абсалютная скрытнасць і патаемнасць супрацоўніцтва, “каб маё імя было толькі вядома асобе, якая вядзе са мною перапіску” [3, с. 3].

15 ліпеня 1893 года Азеф атрымаў ад паліцыі 100 рублёў у якасці жалавання, гэтым пацвярджалася – Азеф залічаны на службу тайным супрацоўнікам Расійскага Дэпартамента паліцыі [3, с. 4].

Па рэкамендацыі паліцыі Азеф спярша прылічваў сябе да марксістаў, пасля, па волі паліцыі, аб’явіў сябе “леваком” – ярым прыхільнікам тэрарыстычных метадаў рэвалюцыйнай барацьбы; сярод рэвалюцыянераў усяляк праслаўляў тэрор, спрабаваў абгрунтаваць, быццам толькі выключна тэрорам магчыма ўсяго дабіцца і вырашыць любыя рэвалюцыйныя задачы, быццам толькі бомба – дастойная зброя сапраўднага рэвалюцыянера.

Паведамленні яго ў паліцыю аб рэвалюцыянерах, іх планах і настроях, вызначаліся дакладнасцю, лаканічнасцю і канкрэтнасцю. “Патрэбна асобую ўвагу звярнуць Вам на г. Карповіча, – даносіў у паліцыю Азеф, – …асобую ўвагу патрэбна звярнуць на Зензінава… Люксембург – рэдактар польскай сацыялістычнай газеты” [4, с. 110].

Азеф завёў знаёмствы сярод рэвалюцыйных колаў Германіі і Швейцарыі, пры гэтым пазбягаў публічных выступленняў на сходках, імкнуўся прытрымлівацца іншай лініі – быццам ён не тэарэтык, а толькі практык, яго справа – не гучная рэвалюцыйная фраза, а канкрэтныя рэвалюцыйныя дзеянні. Блізкія да Еўна людзі, у прыватнасці яго жонка Люба, пацвярджала, што яе муж не прамоўца, на людзях “не мог і двух слоў звязаць як трэба” [3, с. 4].

З Любай Мінкінай ён пазнаёміўся у красавіку 1895 года, бацька якой меў краму ў Магілёве. Яна вучылася на філасофскім факультэце Бернскага ўніверсітэта, па водгукам, была мілай дзяўчынаю, і … перакананай, і смелай рэвалюцыянеркай. У асабістым жыцці Еўна Фішалевіча адбылася важная перамена – маладыя ўступілі ў шлюб. Але хутка адкрылася, што характары ў іх розныя. Паколькі Люба вучылася ў Берне, з Еўна сустракалася толькі на кароткі час у Германіі ці ў Швейцарыі, аднак і гэтыя кароткія сустрэчы не прыносілі ім радасці, бо адразу пачыналіся скандалы. “Але варта нам хаця б тыдзень пражыць разам, – успамінала Люба Азеф, – як у нас пачыналіся сваркі, бо натуры ў нас былі зусім розныя” [3, с. 6].

Сапраўды, характар у Еўна Фішалевіча быў, як кажуць, не цукар, калі не сказаць большага. Еўна перад знаёмымі і сябрамі паводзіў сябе не шчыра, хацеў усім даказаць, быццам ён чалавек бедны, ва ўсім церпіць нястачу; разам з тым ён быў помслівым, скрытным, злапамятным. Калі ён пачаў атрымоўваць ад паліцыі значныя сродкі, перад ім паўстала праблема: як растлумачыць блізкім, адкуль у яго, чалавека беднага, такія грошы? Хітры Еўна і тут адшукаў выхад: ён на віду ў знаёмых шмат дасылаў у розныя яўрэйскія дабрачынныя арганізацыі слязлівыя лісты аб матэрыяльнай дапамозе, і быццам адтуль атрымоўваў значныя сродкі. Калі гэты прыём састарэў, Еўна прыдумаў іншую крыніцу свайго прыбытку: быццам выявіўся нейкі міфічны багацей Цімафеяў, які пералічваў на яго рахунак значныя сродкі [3, с. 5]. Азефу ўдавалася ўводзіць у зман блізкіх, нават жонку, якая аж да выкрыцця яе мужа як паліцэйскага агента нават не падазравала аб яго дваістым жыцці, аб сапраўдных крыніцах іх сямейнага прыбытку.

З Карлсруэ Азеф пераехаў у Дармштадт, дзе ў 1899 годзе атрымаў дыплом інжынера-электрыка ў мясцовым палітэхнічным інстытуце. Навучанне ў інстытуце Еўна Фішалевіч сумяшчаў з актыўнай рэвалюцыйнай дзейнасцю; у рэвалюцыйных гуртках ён паступова набыў папулярнасць. Задаволены Азефам быў і Дэпартамент паліцыі, які за звесткі аб рэвалюцыянерах падвоіў яму жалаванне і пачаў дадаткова выплачваць значныя суммы ўзнагародных. Пашанцавала Еўна і з працай: ён уладкаваўся інжынерам-электрыкам у нямецкую фірму на высокааплатную пасаду.

Здавалася, беднасць пераадолена, прыйшоў матэрыяльны дастатак, у Азефа адкрылася магчымасць парваць з паліцыяй, каб спакойна жыць і працаваць за граніцай. У тыя часы агенту парваць адносіны з паліцыяй было вельмі проста – калі агент не прадстаўляў патрэбнай інфармацыі, паліцыя спярша скарачала яму жалаванне, а затым развітвалася з ім. Але Азеф пайшоў іншым шляхам – ён прыняў прапанову Дэпартамента паліцыі пераехаць у Расію, дзе яму было абяцана высокааплатнае месца ў нямецкай фірме і істотная прыбаўка жалавання ад паліцыі. У лістападзе 1899 года Азеф пераехаў у Маскву і з гэтага часу пачаўся новы этап яго канфідыцыяльнага супрацоўніцтва з царскай паліцыяй, які меў шэраг адметных асаблівасцей.

Пасля вяртання ў Расію Азеф быў прыкамандзіраваны да маскоўскага ахоўнага аддзялення, якое ў той час узначальваў вядомы жандарскі дзеяч Сяргей Васільевіч Зубатаў. Еўна Фішалевіч шмат чаму навучыўся і пераняў у Зубатава. Навучанню садзейнічала і выдатная памяць Азефа: ён ніколі не запісваў і не блытаў адрасы явак, тэлефоны, прозвішчы рэвалюцыянераў, выдатна арыентаваўся сярод гарадскіх вуліц і завулкаў.

У 1899 годзе ў Еўна Фішалевіча адбылася яшчэ адна важная падзея – ён зблізіўся з гурткамі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, заваяваў там аўтарытэт, што адразу было высока ацэнена Дэпартаментам паліцыі. У 1900 годзе яму было павялічана жалаванне да 150 рублёў, а ў 1901 годзе – да 500 рублёў у ме-

сяц [5, с. 3], па таму часу значныя сумы, калі параўнаць іх з месячнымі акладамі царскіх афіцэраў ці нават генералаў. У Ваеннай энцыклапедыі (Пб., т. IX, 1912, с. 147) прыводзяцца наступныя дадзеныя аб заробках ваенных у 1899 годзе: месячны аклад утрымання малодшага афіцэра арміі (падпаручніка) складаў 55 рублёў; ротнага камандзіра (капітана) – 105, камандзіра батальёна (падпалкоўніка) – 145 рублёў, камандзіра палка (палкоўніка) – 325, начальніка дывізіі (генерал-лейтэнанта) – 500 рублёў. Радавому Азефу, як бачым, паліцыя выплачвала сумы, якія раўняліся месячнаму акладу царскага начальніка дывізіі – генерал-лейтэнанта.

Атрымоўваў Азеф жалаванне і ад партыі эсэраў, яно было сціплым – прыкладна 125 рублёў у месяц [5, с. 3, 4]. Але гэта – афіцыйнае жалаванне. Справа ў тым, што ўся інфармацыя аб Баявой арганізацыі, зыходзячы з патаемнага характару яе дзейнасці (тэрарызм), у партыі эсэраў была абсалютна закрытай. Ніякіх справаздач аб фінансавых расходах Азэф як кіраўнік баявікоў нікому не прадстаўляў, нават членам ЦК. Пры гэтым у эсэраў было правіла: колькі просіць Баявая арганізацыя, толькі сродкаў і даваць. Каб уявіць памеры фінансаў баявікоў, спашлёмся на іх расходы, якія з вясны па зіму 1906 года складалі фантастычную суму – да 1000 рублёў у дзень [5, с. 15]. Улічваючы непамерную прагу Азефа да грошай і яго поўную бескантрольнасць, можна толькі здагадвацца, якімі сумамі ён валодаў у тыя часы.

На людзях, па старой звычцы, Азеф імкнуўся паказаць сябе сціплым і эканомным. Расказвалі аб такім выпадку: на вакзале сябры прасілі Азефа наняць насільшчыка, але Еўна Фішалевіч наадрэз адмовіўся: маўляў, нельга без крайняй патрэбы “расточать партийные деньги” і ўпарта цягнуў на сабе цяжкую паклажу. Некаторыя члены ЦК партыі эсэраў верылі ў сціпласць Азефа і гаварылі аб ім: “сядзіць на хлебе і сялядцах” [5, с. 4]. Але Азеф, як толькі заставаўся адзін, – адразу перайначваўся: ён падарожнічаў у самых дарагіх вагонах кур’ерскіх паяздоў, наведваў самыя шыкоўныя рэстараны, траціў фантастычныя сумы, у некалькі тысяч рублёў, на падарункі сваім палюбоўніцам.

У 1902 годзе на базе гурткоў была заснавана партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэраў). У праграму партыі ўваходзілі патрабаванні сацыялізацыі зямлі (яе нацыяналізацыя), усталяванне дэмакратычнай рэспублікі, прызнанне дзяржавай грамадзянскіх правоў асобы і яе свабоды. Эсэры заявілі, што тэрор – частка іх афіцыйнай палітыкі, якая скіравана на тое, каб справакаваць урад на рэпрэсіўныя меры, тым самым выклікаць шырокае народнае нездавальненне, а магчыма і паўстанне. Частка эсэраў лічылі, што тэрор застрашыць царскі ўрад і прымусіць цара на радыкальныя палітычныя рэформы [6, с. 187–188].

Для ажыццяўлення тэрору была ўтворана Баявая арганізацыя, якая дзейнічала ў Расіі ў 1902–1911 гадах; уваходзіла ў партыю эсэраў на правах аўтаномнай адзінкі, была строга засакрэчанай, нешматкольканай – за ўсе гады яе існавання праз яе прайшло ўсяго каля 78 чалавек [7, с. 1]. Баявую арганізацыю ў розныя гады ўзначальвалі Рыгор Гершуні, Еўна Азеф і Барыс Савінкаў.

У 1903 годзе, пасля арышта Гершуні, фактычная ўлада ў Баявой арганізацыі перайшла да Азефа, аб чым ведала толькі вельмі вузкае кола членаў ЦК партыі эсэраў. Для канспірацыі Азеф карыстаўся партыйнымі псеўданімамі – “Іван Мікалаевіч”, “Валянцін Кузьміч”, “Тоўсты”; пры нягласных кантактах з паліцыяй – псеўданімам “Раскін” [8, с. 2].

Узначаліўшы Баявую арганізацыю, Азеф правёў яе рэфармаванне: увёў новыя формы і метады яе тэрарыстычнай дзейнасці. Ён адмовіўся ад выкарыстання пры тэрактах агнястрэльнай зброі, галоўны ўпор быў зроблены на выбуховыя прыстасаванні (бомбы). Для гэтага ў Швецарыі былі абсталяваны некалькі патаемных лабараторый, якія займаліся вырабам дынаміту. Баявікі былі падзелены на групы, кожная мела свае канкрэтныя задачы: частка баявікоў адказвала за дынаміт і бомбы, іншыя сачылі за кожным крокам той асобы, на якую планаваўся тэрарыстычны замах, асобную групу складалі баявікі-выканаўцы тэрактаў. Азеф увёў у арганізацыі строгую дысцыпліну, жорсткую адказнасць за выкананне загадаў (прысудаў) партыі. Ён увёў жорсткую сістэму канспірацыі, у тым ліку і асабіста для сябе, гэта дазваляла яму працаваць на два франты – на паліцыю і эсэраў. Азеф, як правіла, планаваў адразу некалькі тэрарыстычных актаў. Планы некаторых тэрактаў ён раскрываў паліцыі, чым умацоўваў веру, быццам ён «незаменимый и весьма ценный агент»; некаторыя тэракты ён ажыццяўляў у тайне ад паліцыі, каб заслужыць давер партыі эсэраў, быццам Баявая арганізацыя ў надзейных руках, яна паспяховая у тэрарызме.

Для ажыццяўлення тэрарыстычных актаў Азеф старанна падбіраў патрэбныя кадры. У Баявую арганізацыю прымаліся людзі толькі пасля ўсебаковай праверкі іх маральных і дзелавых якасцей, якія мелі, як правіла, сярэднюю адукацыю, былі перакананымі рэвалюцыянерамі, гатовымі ў імя высокіх рэвалюцыйных ідэалаў самаддана ахвяраваць нават уласнае жыццё. Прывядзем аналіз склада Баявой арганізацыі эсэраў за 1903–1906 гады. У арганізацыю ўваходзілі 64 баявікі – 51 мужчына і 13 жанчын. Цікавы сацыяльны састаў баявікоў: 13 – з дваран, 5 – выхадцы з сямей святароў, 10 – з купецкіх сем’яў, 27 – былі мяшчанамі і толькі 6 баявікоў былі з сялян. Высокім быў і іх адукацыйны ўзровень: вышэйшую адукацыю мелі 6 баявікоў, 28 – былыя студэнты вышэйшых навучальных устаноў, 24 мелі сярэднюю адукацыю і толькі 6 баявікоў закончылі пачатковую школу. Сярод баявікоў было 19 яўрэяў, рускія і некалькі палякаў. Касцяк Баявой арганізацыі сладалі маладыя людзі ва ўзросце 20–30 гадоў [7, с. 6].

Як сведчаць прыведзеныя дадзеныя, Азеф сумеў залучыць у Баявую арганізацыю маладых, энергічных людзей розных саслоўяў, як мужчын, так і жанчын; больш паловы баявікоў мелі вышэйшую ці сярэднюю адукацыю.

Перад Азефам як новым кіраўніком Баявой арганізацыі паўстала нялёгкая задача – не толькі адрадзіць былы аўтарытэт баявікоў, але і падняць свой уласны імідж як у партыі эсэраў, так і ў паліцыі. Для гэтага патрэбна была гучная рэвалюцыйна справа, знакавы тэракт, які ўскалыхнуў бы ("вздыбил бы") Расію.

Выбар Азефа ўпаў на дзяржаўнага дзеяча Расійскай імперыі Вячаслава Канстанцінавіча Плеве, які з 1902 года займаў пасаду міністра ўнутраных спраў і шэфа корпуса жандараў, праводзіў палітыку разлажэння рэвалюцыйнага руху знутры, пашырэння ўлады губернатараў, ён быў прыхільнік пагубнай для Расіі руска-японскай вайны. Менавіта яму многія прыпісвалі крылатую фразу, быццам "маленькая перамагаюносная вайна ўтрымае Расію ад рэвалюцыі". Рэпрэсіўнай палітыкай Плеве былі незадаволены многія ў Расійскай імперыі, таму яго забойства, на думку Азефа, абяцала быць гучнай і знакавай падзеяй.

У групу для замаху на Плеве Азеф уключыў лепшых баявікоў, сярод якіх былі Барыс Савінкаў, Аляксей Пакацілаў, Іван Каляеў, Ягор Сазонаў і іншыя. Падрыхтоўка групы вялася ў Парыжы, куды Азеф перанёс штаб Баявой арганізацыі. Вясной 1904 года эсэры-баявікі па падробленых дакументах, па аднаму, прыехалі ў Расію, дзе сустрэліся з нечаканай перашкодай – у іх паявіўся канкурэнт. Гэта была група нейкай Серафімы Крытчоглу, якая таксама рыхтавала замах на жыццё Плеве. Азеф паспрабаваў адгаварыць Серафіму ад тэракта, але тая наадрэз адказала яму. Тады Азеф выдаў яе групу паліцыі, былі арыштаваны 60 паплечнікаў Серафімы. Такім чынам, паліцыя, не ведаючы таго, сама *расчысціла* дарогу тэрарыстам-эсэрам для замаху на жыццё свайго ж начальніка – міністра ўнутраных спраў Расіі.

Каб усыпіць пільнасць паліцыі і адцягнуць яе ўвагу ад аховы Плеве, Азеф дэзінфармаваў яе. Спярша ён інфармаваў паліцыю, быццам эсэры плануюць замах не на Плеве, а на дырэктара Дэпартамента Лапухіна; затым – быццам плануецца забойства Іркуцкага генерал-губернатара [2, с. 156].

Заблытаўшы паліцыю і адцягнуўшы яе ўвагу ад аховы Плеве, Азеф прыняў самыя энергічныя меры для арганізацыі супраць яго тэракта. Кіраўніком групы ён прызначыў Барыса Савінкава. Каб выключыць усякую няўдачу, былі прызначаны чатыры бамбісты, якія, калі не спрацуе першая бомба, павінны па чарзе кідаць бомбы ў Плеве. Сам Азеф з'ехаў у Варшаву, адтуль накіраваў у Дэпартамент паліцыі нейкую тэлеграму, каб забяспечыць сабе алібі.

Эсэру-тэрарысту Ягору Сазонаву 28 ліпеня 1904 года ўдалося кінуць бомбу ў карэту Плеве, міністр памёр на месцы здарэння. Забойства міністра было аплачана высокаю цаною. Аляксей Пакацілаў загінуў у сакавіку 1904 года з-за выпадковай дэтанацыі самаробнай бомбы. Сікорскі і Сазонаў былі затрыманы на месцы злачынства і былі асуджаны – Сікорскі да 20 гадоў катаргі, а Сазонаў – да вечнай (безтэрміновай) катаргі. У 1910 годзе Ягор Сазонаў пакончыў з сабою ў катаржнай турме. Іван Каляеў здолеў уцячы ў Швейцарыю.

Але найбольшыя барышы за забойства Плеве як ад эсэраў, так і ад паліцыі атрымаў асабіста Азеф. Па сведчанні Спірыдовіча, Азеф за граніцай быў "сустрэты як трыумфатар", нават сама "бабуля рускай рэвалюцыі", рэвалюцыянерка-народніца Кацярына Канстанцінаўна Брэшка-Брашкоўская "пакланілася яму па-рускі да зямлі" [2, с. 158]. Эсэры адзначылі забойства Плеве такой папойкай, якая, па сведчанні Спірыдовіча, "не абышлася без умяшання паліцыі" [2, с. 158].

Атрымаў Азеф выгоды і ад паліцыі: яму было падвоена жалаванне з 500 да 1000 рублёў у месяц; столькі ж, калі не больш, паліцыя выплачвала яму пад відам рознага роду даплат: сутачных, прэміяльных, узнагародных і г.д. Толькі ўзнагародных у 1904–1905 гадах Азеф атрымліваў па некалькі тысяч рублёў [5, с. 4].

Такім чынам, заахвочваемы з двух бакоў – эсэрамі і паліцыяй – Азеф служыў на два франты: крыху на рэвалюцыю, крыху на імперыю, а фактычна – на свой асабіста аўтарытэт і …ўласную кішэню.

Даследчыкамі падлічана: Азеф арганізаваў больш 30 тэрарыстычных актаў, у якіх загінулі міністр унутраных спраў Плеве, былы генерал-губернатар Масквы і камандуючы войскамі Маскоўскай ваеннай акругі вялікі князь Сяргей Аляксандравіч, Пецярбургскі граданачальнік Лаўніц, галоўны ваенны пракурор В.П. Паўлаў. Адначасова Азеф працаваў і на карысць паліцыі – ён выдаў паліцыі першы склад ЦК партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, шмат эсэраў-баявікоў, па яго даносу ў 1901 годзе быў выкрыты "Паўночны саюз рэвалюцыянераў", арыштаваны дзеячы партыі А. Аргуноў, Е. Коласаў, разбурана падпольная тыпаграфія і інш. [2, с. 230].

Цэнтральнай задачай "Баявой арганізацыі" і сваёй асабістай Азеф лічыў тэракт у адносінах імператара Мікалая II. Дакументы сведчаць што Азеф распрацоўваў розныя планы забойства цара, некаторыя з іх больш нагадвалі фантазіі, чым рэальныя справы. Так, у Азефа ўзнікла ідэя з дапамогай аэраплана нанясці бомбавы ўдар па Зімоваму палацу – рэзідэнцыі Мікалая II. Пабудаваць такі аэраплан узяўся інжынер Сяргей Бухало, які жыў у Мюнхене. Па разлікам Бухало, яго аэраплан мог ляцець з хуткасцю да 140 кіламетраў у гадзіну і перавозіць лётчыка і бомбу вялізнай выбуховай сілы. На пабудову аэраплана патрабавался значная сума – 20 тысяч рублёў. Але ажыццявіць гэты праект не ўдалося, бо пасля выкрыцця Азефа як правакатара эсэры адмовіліся фінансаваць такі затратны і рызыкоўны план.

Апошняй правакатарскай справай Азефа была выдача ім паліцыі ў лютым 1908 года Лятучага Баявога атрада сацыялістаў-рэвалюцыянераў, гэта паслужыла пісьменніку Леаніду Андрэеву сюжэтам для яго вядомага апавядання “Рассказ о семи повешанных”.

Крывавая тактыка эсэраў выклікала ў грамадстве непаразуменне. Патрабавалася растлумачыць, чаму партыя эсэраў праводзіць палітыку тэрору і ў чым яе рэвалюцыйны сэнс. З гэтай мэтай 15 ліпеня 1904 года эсэры на французскай мове апублікавалі адозву “Да ўсіх грамадзян цывілізаванага свету”, у ёй гаварылася, што эсэры, як і іх папярэднікі з “Народнай волі”, “во всеуслышание порицаем… террор как тактическую систему в свободных странах”. Але ў Расіі, “где деспотизм исключает всякую открытую политическую борьбу, – адзначалася ў дакументе, – мы вынуждены противопоставить насилию тирании силу революционного права” [7, с. 9].

Сітуацыя ў Расіі шмат у чым змянілася з выхадам Маніфеста 17 кастрычніка 1905 года, якім былі абвешчаны “непахісныя асновы грамадзянскай свабоды”, у тым ліку недатыкальнасць асобы, свабода сумлення, слова, сходаў і саюзаў, пашырэнне выбарчага права ў Дзяржаўную думу. Абвяшчэнне грамадзянскіх свабод патрабавала змянення тактыкі: пасля Маніфеста Цэнтральным Камітэтам эсэраў была прыпынена тэрарыстычная дзейнасць партыі і фактычна ліквідавана яе Баявая арганізацыя, але не надоўга.

У канцы снежня 1905 – пачатку студзеня 1906 года ў Фінляндыі адбыўся чарговы з’езд партыі эсэраў, які абраў новы склад ЦК, у які ўвайшоў і Азеф. Новы ЦК вырашыў *аднавіць тэрор* на той падставе, бо царскі ўрад для захавання старых парадкаў і для задушэння рэвалюцыі ўжывае ўзброеную сілу. На аснове гэтага рашэння Азеф і Савінкаў на тэрыторыі Фінляндыі пачалі адраджаць Баявую арганізацыю, сюды і пачалі з’язджацца былыя баявікі, якія зноў атрымалі фінансаванне, зброю, выбуховыя рэчы. ЦК партыі эсэраў прыняў рашэнне аб правядзенні новых тэрактаў, на гэты раз супраць міністра ўнутраных спраў Пятра Дурново і маскоўскага генерал-губернатара Фёдара Дубасава. Планаваліся замахі на жыццё адмірала Чухніна, які задушыў паўстанне на крэйсеры “Ачакаў”, і генерала Міна, які загадаў страляць у снежні 1905 года па паўстанцам у Маскве.

Але ажыццявіць планы не ўдавалася, тэракты правальваліся адзін за другім. Была кінута бомба ў экіпаж Дубасава, але загінуў эсэр-бамбіст, а Дубасаў быў толькі паранены [7, с. 17]. Не ўдалося Баявой арганізацыі ажыццявіць замахі на жыццё адмірала Чухніна і генерала Міна, на кіраўніка палітычнага вышука Расіі Рачкоўскага. Праваліліся замахі на пецярбургскага граданачальніка Трэпава, вялікага князя Уладзіміра Аляксандравіча, які загадаў салдатам страляць падчас вядомай “Крывавай нядзелі” 1905 года. У Кіеве не атрымалася спроба замаха на губернатара Клейгельсома. У той жа час паліцыя сумела нанесці шэраг адчувальных удараў па эсэраўскім баявікам: 16–17 сакавіка 1905 года былі арыштаваны 17 членаў Баявой арганізацыі; 30 чэрвеня 1905 года быў затрыманы бліжэйшы паплечнік Барыса Савінкава Хаім Гершковіч, а 20 жніўня ён быў павешаны [7, с. 12]. З красавіка па жнівень 1906 года паліцыяй былі арыштаваны яшчэ каля дзесяці членаў Баявой арганізацыі [7, с. 20].

Правалы і няўдачы Баявой арганізацыі сталі прадметам вострай яе крытыкі. Азеф і Савінкаў паставілі на ЦК пытанне аб даверу. Давер ім быў аказаны, але ЦК патрабаваў для адраджэння аўтарытэта партыі арганізаваць замах на пецярбургскага граданачальніка Лаўніца і прэм’ер-міністра Расійскай імперыі Сталыпіна. Але ад замаху на Сталыпіна прышлося адмовіцца, бо паліцыяй былі прыняты сур’ёзныя дадатковыя меры па яго ахове.

Няўдачы эсэраў-тэрарыстаў, іх арышты паліцыяй прывялі да таго, што амаль на год былі прыпынены справы цэнтральнага тэрору [7, с. 13]; у партыі эсэраў пачаліся разборкі: хто *вінаваты* ў правалах Баявой арганізацыі?

Сярод эсэраў блукалі чуткі, быццам няўдачы Баявой арганізацыі звязаны з дзейнасцю *патаемнага* правакатара, які выдае паліцыі сакрэтныя планы баявікоў. Падазрэнні ў правакатарстве ўпалі на Азефа, справа дайшла нават да яго публічнага абвінавачвання. Спашлёмся на такі факт. У Жэневе эсэры сустракалі новы, 1905 год. Моладзь спявала рэвалюцыйныя песні, з імі бавіў час і Азеф. Затым пачалі гуляць “у пошту” – разносілі “пісьмы”, у якіх у жартоўнай форме выказваліся розныя навагоднія пажаданні. Атрымаў такое “пісьмо” і Азеф, які раскрыў яго і па традыцыі прачытаў услух – у “пісьме” Азефа называлі “подлецом, негодяем и предателем” [5, с. 6]. Патрэбна аддаць належнае вытрымцы і знаходлівасці Азефа – яму ўдалося абвінавачванні перавесці на… навагодні жарт. Але і ў ЦК партыі эсэраў паступалі пісьмы, у якіх Азеф абвінавачваўся ў патаемным супрацоўніцтве з паліцыяй.

Паўстае пытанне: чаму кіраўніцтва партыі эсэраў не прымала неабходных мер у адносінах Азефа? Каб зразумець паводзіны партыйнага кіраўніцтва, патрэбна нагадаць тую гістарычную абстаноўку, у якой давялося дзейнічаць эсэрам, – гэта пастаянныя правакацыі паліцыі, частыя правалы, бясконцыя арышты, недавер сярод саміх эсэраў. Чуткі аб правакатарстве Азефа – кіраўніка баявікоў – балюча ўспрымаліся кіраўніцтвам партыі, бо гэта абражала не толькі аўтарытэт ЦК, але і ўсёй партыі. “Распаўсюджванне чутак, якія ганьбілі главу баявой арганізацыі Азефа, – пісаў у сваіх успамінах Барыс Савінкаў, – абражалі гонар партыі… Абарона гэтага гонару з’яўляецца маім партыйным доўгам” [9, с. 198].

Сходную пазіцыю займалі і іншыя кіраўнікі эсэраў. Міхаіл Гоц неяк спытаў Г. Плеханава, як быць, бо маюцца звесткі аб правакатарстве Азефа. Плеханаў абыякава адказаў: “Аба мне і Лаўрове гаварылі тое самае” [5, с. 6]. Азеф як арганізатар паспяховых тэрактаў супраць Плеве, вялікага князя Сяргея Аляксандравіча быў на той час у вачах эсэраў героем, амаль не святыняй партыі. А што датычыцца чутак, у абстаноўцы паліцэйскіх правакацый аб кім не распускаліся зняважальныя чуткі? Паказальна і такая сітуацыя. Нават пасля 17-га пасяджэння партыйнага суда над Азефам (усяго было 18 пасяджэнняў), Вера Фігнер сказала Бурцаву, галоўнаму выкрывацелю Азефа: “Вы жахлівы чалавек, вы зняславілі героя, вам застаецца толькі застрэліцца” [5, с. 7].

Працэс выкрыцця Азефа як правакатара мы можам прасачыць па ўспамінах Барыса Савінкава. Савінкаў адзначаў, што Бурцаў, галоўны рэдактар часопіса “Былое”, расказаў яму, быццам ў 1906 годзе да яго ў рэдакцыю завітаў нейкі чалавек, які прадставіўся чыноўнікам для асобых даручэнняў пры варшаўскім ахоўным аддзяленні. Чыноўнік расказаў, што з паліцыяй супрацоўнічае нейкі член партыі эсэраў, які вядомы яму пад псеўданімам *“Раскін”*. Прааналізаваўшы гутарку з чыноўнікам, Бурцаў прыйшоў да высновы, што здраднік – *Азеф*. Але каб канчаткова пераканацца ў гэтым, Бурцаў сустрэўся з былым начальнікам дэпартамента царскай паліцыі Лапухіным, і той пацвердзіў, што Азеф *сапраўды* супрацоўнічаў з паліцыяй [9, с. 390–397].

Матэрыялы на Азефа Бурцаў перадаў ЦК партыі эсэраў; партыйны суд над Азефам пачаўся ў Парыжы ў кастрычніку 1908 года і цягнуўся да студзеня 1909 года. Спярша кіраўнікі партыі Чарноў, Натансон і Савінкаў не паверылі Бурцаву і ўсяляк адстойвалі Азефа. Але Азеф, не на жарт напалоханы судом, дапусціў памылку: 11 лістапада 1908 года ён тайна прыехаў у Расію, сустрэўся з Лапухіным і літаральна *ўмольваў* яго адказацца ад сваіх паказанняў. Але алібі Азеф не займеў, бо Лапухін наадрэз адказаў яму. Як адзначае ў сваіх мемуарах Барыс Савінкаў, гэты факт стаў вядомы кіраўніцтву партыі эсэраў і партыйнаму суду, якім адкрыліся непраўдзівасць, фальшывасць паказанняў Азефа і яго віна ў супрацоўніцтве з паліцыяй [9, с. 397–408).

За выкрыццё Азефа пацярпеў і А.А. Лапухін, які ў 1902–1905 гадах займаў пасаду дырэктара Дэпартамента паліцыі Расіі. Некаторых даследчыкаў і сёння здзіўляе пытанне: як ён мог парушыць службовую тайну і выдаць эсэрам сакрэтнага агента Азефа? У літаратуры ёсць розныя тлумачэнні гэтай падзеі.

На наш погляд, у дадзенай сітуацыі Лапухін у большай меры кіраваўся ўласнымі амбіцыямі, чым інтарэсамі імперыі. Вядома, што ў Расіі меў месца скрыты скептытызм у адносінах паміж пракуратурай і паліцыяй. Лапухін прыйшоў у паліцыю менавіта з пракуратуры, таму для яго на новым месцы службы “усё было не так”, таму ён з пылам прыняўся за… удасканальванне паліцэйскай сістэмы імперыі. Ва ўмовах самадзяржаўя яго рэформы, вядома, не прайшлі, а іх ініцыятар быў зволены з паліцэйскай службы. Лапухін затаіў крыўду, якая адчувалася са старонак яго кнігі “Из итогов служебного опыта (настоящее и будущее русской полиции”, якую ён апублікаваў пасля звальнення з паліцыі. На нашу думку, менавіта затаённая крыўда, што ён аказаўся пакінутым і незразумелым царскімі ўладамі ў яго лепшых імкненнях, падбухторыла яго публічна заявіць аб сабе, няхай і праз *скандал* – праз выкрыццё агента Азефа. Зразумела, гэта было грубым парушэннем дзяржаўных сакрэтаў імперыі. Справа дайшла да Мікалая ІІ, які загадаў судзіць Лапухіна крымінальным судом. Але ў крымінальным законе Расійскай імперыі не мелася артыкула, які прадугледжваў бы пакаранне за выкрыццё правакатара. Каб выканаць манаршую волю “Особым присутствием Сената”, Лапухін быў асуджаны на 5 гадоў катаргі “за прынадлежнасть да партыі эсэраў і ў садзейнічанні ёй” [2, с. 247]. Нават і сёння цяжка ўявіць сабе, каб дырэктар Дэпартамента паліцыі прынадлежаў …да тэрарыстычнай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Праўда, катарга была яму заменена ссылкай у Сібір, а пазней, калі адкрылася здрадніцтва Азефа і імперыі, і эсэрам, па царскаму ўказу ад 4 снежня 1912 года Лапухін быў памілаваны і адноўлены ў правах [2, с. 247].

Але вернемся да справы Азефа. Перад ЦК партыі эсэраў паўстала пытанне: як паступіць з правакатарам? З дакументаў вядома, што 5 студзеня 1909 года кіраўнікі партыі Чарноў і Савінкаў прыехалі на кватэру Азэфа ў Парыжы і прапанавалі яму адкрыта расказаць аб супрацоўніцтве з паліцыяй, пасля чаго па прыкладу правакатара-народавольца Сяргея Дзегаева спакойна з’ехаць, скажам, у Злучаныя Штаты Амерыкі. Але Азеф усё адмаўляў і праўды кіраўніцтву партыі не адкрыў. Яму было прапанавана падумаць на працягу 12 гадзін, але Азеф па-своему зразумеў прапанову кіраўніцтва партыі і за гэты час бясследна знік з Парыжа [7, с. 22].

Выкрыццё Азефа-правакатара нанесла цяжкі ўдар па партыі эсэраў. Тое, што паліцэйскі агент Азеф на працягу стольких гадоў кіраваў самым сакрэтным падраздзяленнем эсэраў – Баявой арганізацыяй, літаральна страсянула партыю, некаторыя эсэры пакінулі яе, некаторыя ў роспачы пакончылі з сабой. Было ўтрачана ўзаемаразуменне паміж радавымі членамі і кіраўніцтвам партыі, у партыі і ў расійскім грамадстве раслі антытэрарыстычныя настроі. Паказальны такі факт: нават у дакладзе партыйнай следчай камісіі па справе Азефа прагучала асуджэнне тэрору Баявой арганізацыі [7, с. 24].

У такіх умовах Баявая арганізацыя існаваць больш не магла. Гэта разумеў і яе кіраўнік Барыс Савінкаў, які 13 снежня 1910 года запісаў: “я два гады працаваў, але з маёй працы не выйшло нічога, горш,

нашмат горш, чым нічога" [7, с. 24]. У пачатку 1911 года Савінкаў сабраў рэшткі членаў Баявой арганізацыі, якія галасаваннем прынялі рашэнне – арганізацыю распусціць [7, с. 24].

Так завяршылася гісторыя Баявой арганізацыі партыі эсэраў, якая шмат праліла крыві і загубіла чалавечых жыццяў. Даследчыкамі падлічана: за 1909–1911 гады эсраўскімі баявікамі былі здейснены 263 тэрарыстычных акты, іх ахвярамі сталі 2 міністры, 33 генерал-губернатары, губернатары і віцэ-губернатары, 16 граданачальнікаў, начальнікаў акруговых аддзяленняў, паліцмейстраў, пракурораў і іх памочнікаў, начальнікаў вышуковых аддзяленняў, 7 генералаў і адміралаў, 15 палкоўнікаў, 8 прысяжных павераных, 26 агентаў паліцыі і іншых. Усяго за 1901–1911 гады, па падліках даследчыкаў, ад тэрарыстаў пацярпелі каля 17 тысяч чалавек [10]. Бывалі выпадкі, калі эсэры-баявікі памылкова забівалі зусім не тых людзей, на якіх яны планавалі замахі. Так, у 1906 годзе эсэры ставілі мэтай забіць пецярбургскага генерал-губернатара Трэпава, а памылкова забілі генерала Казлова. У Пензе замест жандарскага генерала Празароўскага забілі пяхотнага генерала Лісоўскага, у Кіеве замест жандарскага генерала Навіцкага забілі нейкага адстаўнога армейскага генерала, у Швейцарыі замест міністра Дурново адправілі на той свет нямецкага купца Мюллера [2, с. 95–96].

Тэрор адымаў у партыі шмат сіл і матэрыяльных сродкаў, успрыймаўся неадназначна, гэта выклікала размежаванне ў партыі. Частка эсэраў, прыхільнікаў тэрору, аб'ядналіся ў партыю *"эсэраў-максімалістаў"*, якая правяла шэраг гучных тэрактаў, у іх ліку і падрыў дачы Сталыпіна на Аптэкарскім востраве, у якім загінулі 27 чалавек [7, с. 24]. Частка членаў партыі, не згодная з палітыкай тэрору, утварылі партыю *"народных сацыялістаў"(энэсаў)*, якая выключыла тэрарызм з сваёй праграмы, але захавала ўсе іншыя праграмныя патрабаванні сацыялістаў-рэвалюцыянераў [7, с. 24].

Пасля выкрыцця Азеф наладзіў уцёкі за граніцу, адзначым, пры патуранні кіраўніцтва партыі эсэраў. На гэты бок справы звярнуў увагу і жандарскі генерал А.І. Спірыдовіч, які пісаў у сваіх мемуарах: "Нягледзячы на даказанасць здрадніцтва Азефа, нягледзячы на ўсю статыстыку павешаных і сасланых з-за яго здрадніцтва, верхаводы партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў усё-такі далі магчымасць Азефу безнаказана знікнуць" [2, с. 152]. Азеф з'ехаў у Берлін і зажыў там заможным чалавекам па пашпарце, выдадзенаму Міністэрствам замежных спраў Расіі на імя нейкага Аляксандра Неймайера.

Яго жонка Люба, як толькі даведалася аб правакатарстве Азефа, адразу парвала з ім усялякія сувязі. Азеф жаніўся другі раз, яго жонкай стала былая палюбоўніца, спявачка-немка, з якой ён пражыў да канца жыцця [5, с. 13]. У Берліне Азефы займелі рэпутацыю хлебасольных гаспадароў. Азеф імкнуўся жыць у сваё поўнае задавальненне, ён адпачываў на шыкоўных курортах, наведваў дарагія забаўляльныя ўстановы, модныя летнія пляжы. Паважаў азартныя гульні, неяк ён прайграў 75 тысяч залатых франкаў [5, с. 15].

Але пакой быў нядоўгім. З цягам часу бяспечны Азеф-Неймайер перакінуўся ў недаверлівага, палахлівага чалавека, які ўсяго асцерагаўся і ўсяго баяўся. Каб замясці свае сляды, ён часта мяняў гасцініцы, пашпарты. Чорнай навалай для Азефа стала Першая сусветная вайна, падчас якой ён ушчэнт разарыўся, бо ўсе яго сродкі былі ўкладзены ў расійскія каштоўныя паперы. Каб неяк звясці канцы з канцамі, Еўна Фішалевіч адкрыў у Берліне гарсэтную майстэрню. У чэрвені 1915 года нямецкая паліцыя яго арыштавала як былога сакрэтнага рускага агента. Азеф утрымліваўся ў нямецкай турме да снежня 1917 года. Турэмнае знявольванне цяжка адбілася на здароўі Еўна, ён моцна захварэў (ускладніліся хваробы нырак і сэрца) і 24 красавіка 1918 года памёр ва ўзросце 49 гадоў.

У Берліне, дзе быў пахаваны Азеф, на яго магіле не было ніякага помніка, толькі дошка з нумарам месца "446". Даследчык біяграфіі Азефа Б. Нікалаеўскі вясной 1925 года спытаў яго жонку-немку, чаму на магіле яе мужа няма помніка. "Ведаеце, тут так шмат рускіх, часта ходзяць і сюды, – заклапачона адказала жонка Азефа, – могуць быць непрыемнасці… Лепш не трэба" [11, с. 3]. Безымянная магілка Азефа праз нейкі час забылася і да нашых дзён не захавалася [8, с. 3].

Якія вывады і ўрокі выцякаюць з жыцця і дзейнасці Азефа? У чым яго адметнасць?

Вядомы нам жандарскі генерал А.І. Спірыдовіч, які асабіста ведаў Азефа, даў яму такую абагульняючую характарыстыку: "Азеф мог круціцца ў адзін і той жа час сярод далёка не дурных прадстаўнікоў двух процілеглых лагераў – урада і сацыялістаў-рэвалюцыянераў, заслужыць рэдкі давер як аднаго, так і другога боку. І пазней, калі ён ужо быў выкрыты ў яго двайной гульні, яго з запалам абараняў з трыбуны Дзяржаўнай думы як сумленнага супрацоўніка сам Сталыпін, і ў той жа час за яго рэвалюцыйнае сумленне біліся з пенай на губах такія дзеячы партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, як Гершуні, Чарноў, Савінкаў і іншыя" [2, с. 151–152).

Праз шмат гадоў пасля выкрыцця Азефа як правакатара вядомы публіцыст Марк Аляксандравіч Алданаў так выказаўся аб стане духоўнасці Азефа: "Сапраўднага ўнутранага свету ў Азефа, магчыма, не было і зусім. Было нешта даволі бясформеннае, якое ўключала ў сябе любоў да рызыкі, любоў да грошай, любоў да роляў…" [5, с. 23]. Сапраўды, Азеф сумленна не служыў нікому – ні паліцыі, ні эсэрам, ён кіраваўся іншай жыццёвай логікай – непамернай ганарлівасцю і бязмежнай прагай да грошай. Фенамен гістарычнай постаці Азефа, няхай і адмоўны, у пачатку XX стагоддзя выклікаў настолькі бурны і супярэчлівы грамадскі рэзананс, што ў літаратурны ўжытак быў нават уведзены спецыяльны тэрмін *"азефаўшчына"*,

які ў “Тлумачальным слоўніку рускай мовы” пад рэдакцыяй Д.М. Ушакова (т. 1, 1935) тлумачыцца як “буйная палітычная правакацыя ”.

Азефаўшчына безумоўна адмоўны вопыт, але і такі вопыт у нейкай меры можа быць карысным, бо нездарма кажуць: лепш вучыцца на чужых памылках, чым на ўласных, і не паўтараць іх, асабліва ў такой адказнай справе, як барацьба з тэрарызмам.

Матэрыялы дадзенай працы могуць быць карыснымі для студэнтаў-юрыстаў, якія вывучаюць курс гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі, а таксама для гісторыкаў і юрыстаў, якія даследуюць палітычную гісторыю Расіі і Беларусі пачатку XX стагоддзя.

ЛІТАРАТУРА

1. Терроризм // Большая энциклопедия Кирилла и Мефодия (с изм. и доп., 2009) [Электронный ресурс]. – Диск DVD.
2. Спиридович, А.И. Записки жандарма / А.И. Спиридович. – М.: Худож. лит., 1991. – 268 с. – (Репр. воспр. изд. 1930 г.).
3. Прайсман, Л.Г. Террористы и революционеры, охранники и провокаторы / Л.Г. Прайсаман [Электоронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.kouzdra.ru/page/texts/priceman/index.html. – Дата доступа: 20.02.2012.
4. Письма Азефа (1893–1917) / сост. Д.Б. Павлов, З.И. Перегудова. – М.: Терра, 1994. – 287 с.
5. Алдонов, М.А. Азеф / М.А. Алдонов [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.hrono.ru/ libris/lib a/aldonov asef.html. – Дата доступа: 18.02.2012.
6. Басюк, І.А. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / І.А. Басюк. – Гродна: ГрДУ, 2011.
7. Боевая организация партии социалистов-революционеров [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://ru/wikipedia.org/wiki. – Дата доступа: 22.02.2012.
8. Азеф, Евно Фишалевич [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://ru/wikipedia.org/wiki. – Дата доступа: 17.12.2011.
9. Савинков, Б. Воспоминания террориста / Б. Савинков. – М.: АСТ: Зебра Е, 2009. – 445 с.
10. Терроризм в России // Большая энциклопедия Кирилла и Мефодия. – (С изм. и доп., 2009) [Электронный ресурс]. – Диск DVD.
11. Евгений Филиппович Азеф (Евно Фишалевич): биография [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://to name.ru/biography/evno-azef.htm. – Дата доступа: 17.12.2011.

Паступіў 09.12.2014

HISTORY OF POLITICAL AND LEGAL THOUGHT OF BELARUS AZEF EVNO FISNELEVICH (HISTORY OF FIGHT AGAINST TERRORISM)

I. BASIUK

Article is devoted to revolutionary activity of the native of Belarus Azef Evna Fishelevich, the head of the Fighting organisation of party of socialists-revolutionaries. The tactics of terror used by socialists-revolutionaries, political consequences of this tactics, the reason of its crisis is analyzed. With the help of the method of terror socialists-revolutionaries tried to cause reciprocal repressive measures of the imperial government and a revolt. One part of socialists-revolutionaries considered that terrorist method could help to intimidate the tsar and force him to initiate political reforms. The main attention in article is given to a person of Azef, the head of terrorists and simultaneously the confidential agent of imperial police,and also his life and political career. Some data about structure of the Fighting organisation of socialists-revolutionaries and quantity of victims of its terror is reflected.